# Беражы Вас Бог і полымя свечкі!

## Выкарыстанне грамнічнай свечкі на працягу года

**Той, хто імкнецца зразумець сутнасць абавязковай наяўнасці агню ў структуры абрадавых падзей, павінен памятаць, што беларусы з часоў сівой міфалагічнай мінуўшчыны былі сонца- і вогнепаклоннікамі, таму фактычна ні адзін з абрадаў любой накіраванасці і прымеркаванасці не абыходзіўся без рознай па форме прысутнасці агню. Далей на працягу года жыццяспрыяльная эстафета агню арганічна ўпляталася ў розныя абрадавыя кантэксты, спалучалася з іншымі рытуальнымі атрыбутамі.**



Фота БЕЛТА

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



● Для нашых далёкіх продкаў самым свяшчэнным момантам у сутках быў узыход Сонца, таму, відаць, пачатак пераважнай колькасці абрадаў, прымеркаваных да рознага часу сутак, быў звязаны з запальваннем агню. Невыпадкова Калядная вячэра пачыналася з узыходам на начным небе першай зоркі, а разгавенне на Каляды пасля саракадзённага Пілінаўскага посту — з запальвання той самай "грамніцы". Гэта быў акт своеасаблівага благаславення і перасцярогі, прадметна-падзейнага далучэння да моцы Сонца, якое ў першым выпадку павярнула на новы цыкл жыцця.

● На Юр'я першы раз выганялі жывёлу на пашу. Каб максімальна перасцерагчы галоўную карміцельку сям'і ад розных пашкоджанняў, гаспадыня брала ў рукі грамнічную свечку, вербную галінку і чырвонае яйка і тройчы па Сонцы абыходзіла вакол каровы. Як толькі ўвесь вясковы статак збіраўся на полі, пастухі "замыкалі" яго ў непарушнае кола — абыходзілі вакол статка, трымаючы ў руках гэтыя ж атрыбуты ды яшчэ рог, нож і пугу. Адвячоркам гаспадыня сустракала жывёліну з поля з тым жа наборам свяшчэнных рэчаў, гэтым самым закальцоўваючы раніцай распачатае свяшчэннадзейства. У гэтым выпадку свечку нават не запальвалі, таму што ў двары гарэў асобны агонь, але яе прысутнасць была абавязковай.

● Асаблівае месца ў народным календары займала Купалле, калі Сонца дасягала найбольшага росквіту. Аднак парадокс зямнога існавання заключаецца ў тым, што вяршыня тваёй славы — гэта адначасова паварот да знямогласці, страты актыўнай жыццёвай пазіцыі. Так і Сонца ў наступныя пасля свята дні пачынала здаваць пазіцыі ўладара, аб чым добра ведалі "загнаныя пад венік" у дзень веснавога раўнадзенства сілы цемры. Светлавы дзень паступова пачынаў змяншацца. Таму купальская ноч уяўляла складны вузел процілеглых эмоцый: радавалася Сонца зеніту сваёй славы, радаваліся і нячысцікі, прадчуваючы хуткае панаванне ночы, і неймаверна актыўна паводзілі сябе. Ведаючы гэта, чалавек імкнуўся абясшкодзіць сябе і гаспадарку ад іх магчымага ўздзеяння. Каб ведзьма не забрала малако ў каровы, гаспадыня вешала над дзвярамі серп і крапіву-жыгучку, а да дзвярнога касяка мацавала свечку-грамніцу кнотам уніз.

● Грамнічная свечка суправаджала абрады засявання і зажынак. Яе запальвалі тады, калі насыпалі насенне ў мяхі перад сяўбой і перад тым, як засыпаць у засек першы вымалачаны хлеб. Без грамнічнай свечкі не распачыналі зажынкі. Усё гэта рабілася для таго, каб захаваць палетак ад граду.

## Выкарыстанне грамнічнай свечкі ў сямейна-родавых святах

Свечку-абярэг шырока выкарыстоўвалі і падчас выканання сямейна-родавых абрадаў. Калі дазволіць сабе выказаць гэту знітаванасць у адной паэтычнай метафары, можна смела сказаць, што “грамніца” сустракала душу чалавека на гэтым свеце, вяла яго па асноўных жыццёвых сцежках і была сведкай таго, як душа адлятала.

● У час працяглых родаў, каб паспрыяць нараджэнню дзіцяці, бабка-павітуха шаптала замову: “Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай Маці пакланюся. Прачыста Божа Маці з прастола ўставала, рабе Божай (імя парадзіхі) дзіцятка адмаўляла, сустаўчыкі адмукала...”, прасіла ў хаце, хляве, астатніх пабудовах адамкнуць замкі, адчыніць дзверы і вокны, засовы, расшпіліць гузікі на адзенні, развязаць усе вузлы, а затым запаліць грамнічную свечку. Пасля таго, як яна прымала на рукі securityнованароджанага, немаўля тут жа клалі на стол і тройчы абносілі і хрысцілі той самай “грамніцай”. У гэтым рытуальным дзеянні сфакусіравана надзвычай глыбінная і поліфанічная сімволіка, у якой у месцы знаходжання стала перакрыжоўвалася і знітоўвалася ў адзінае цэлае некалькі гарызонтаў старажытнабеларускіх уяўленняў аб сусвеце і месцы чалавека ў ім.

● “Грамніца”, запаленая над сталом і немаўляткам, — гэта лампада над прастолам і знак з’яўлення анёла-ахоўніка, які тут жа падхапіў эстафету родавай пераемнасці і будзе несці яе аж да скону чалавечага веку. Сімвалічна і тое, што агеньчык новага жыцця падхапіла на рукі ўладарка тайнаў народзінаў — бабка-павітуха. Яна ўжо страціла Божы дар нарадзіць, але атрымала права і статус быць духоўным апекуном парадзіхі, той, якая зараз атрымала права працягваць чалавечы род. Свечка ў руках жанчыны-бабулі — гэта чалавечая споведзь, улонне матулінай душы і сэрца, той нязгасны ачаг, канца якому не будзе ніколі.

● Свечка-грамніца будзе маўклівым сведкам яшчэ адной вялікай тайны ў чалавечым жыцці — таінства хрышчэння: адпраўляючы разам з хроснымі бацькамі дзіця да храма, родныя бацькі давалі ім асноўны хатні абярэг. Захавайце тую свечку-грамніцу, з якой вы хрысцілі дзіця і запаліце яе тады, калі будзеце адпраўляць маладых да вянца. Гэту эстафету далей падхопяць вянчальныя свечкі! Дарэчы, мы тут не прапаноўваем нічога новага, проста дапаўняем адным штрыхом тое, што рабілі нашы мудрыя продкі.







● Было б проста цудоўна і ў вышэйшай ступені сімвалічна, калі б сённяшнія маладыя бацькі паступілі наступным чынам. Роўна ў год дзіця першы раз стрыглі. Валасы гэтыя захоўвалі ўсё жыццё за абразамі. Калі чалавек ішоў служыць у войска або на вайну, на парозе роднай хаты маці выстрыгала пасмачку валасоў і клала да валасоў першага пастрыгу, адтуль жа брала пасмачку яго дзіцячых валасоў і рабіла ладанку (гэтыя ж валасы закручвала ў воск той самай грамнічнай свечкі), аддавала з сабой у дарогу: хлопец пройдзе агонь, ваду і медныя трубы, але выжыве.

● Запальвалі “грамніцу” і ў той момант, калі збіраліся аднімаць дзіця ад грудзей. Уся родавая міжпакаленная інфармацыя перадавалася дзіцяці з малаком матулі. І вось прыходзіў час, калі гэту прыродна-біялагічную сувязь трэба было разарваць. З гэтага часу сімвалам самастойнага пераадолення дарогі на Вялікім жыццёвым шляху чалавека стане сямейны талісман — “грамніца”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Свечку-“грамніцу” давалі ў рукі цяжка паміраючаму чалавеку, а потым ставілі каля галавы памерлага. Яна павінна была дапамагаць душы нябожчыка пакінуць хату так, каб не “пакрыўдзілася” ды не “выгледзела” сабе яшчэ каго-небудзь са сваякоў. Аднак трэба памятаць: калі ў іншых выпадках свечкай-грамніцай карысталіся на працягу года ў самых розных сітуацыях, то ў выпадку смерці чалавека яна павінна была згарэць уся ў гэты ж дзень, каб яе ніхто не змог выкарыстаць у іншыя, святочныя, дні з мэтай нанясення людзям шкоды.

У адпаведнасці з народнымі ўяўленнямі дарога заўсёды была непрадказальнай, таямнічай, таму адпраўляючыся ў далёкі шлях, чалавек выконваў спецыяльныя рытуальныя дзеянні (“прысесці на дарожку”), браў з сабой розныя абярэгі (пояс, нож), гаварыў словы замовы ці малітвы. Пераадоленне дарогі — гэта бадай што самы інтэнсіўны канал усебаковай інфармацыі: хто сустрэнецца першым, хто пяройдзе дарогу, стан надвор’я, незвычайныя прыродныя аб’екты (камень-следавік, крыж, крыніца).

Яшчэ больш высокім статусам надзялялася дарога ў кантэксце абрадаў: калі дзіця неслі хрысціць, калі ішла пахавальная працэсія, калі ехалі да вянца і назад. Ва ўсіх гэтых выпадках, вядома ж, не абыходзіліся без сімвала агню — грамнічнай свечкі, якая, верылі, будзе адганяць нячыстую сілу. “Грамніцу” бралі з сабой, калі ішлі сватаць дзяўчыну, калі дружына маладога ехала выкупаць нявесту, калі вясельны поезд адпраўляўся да вянца, калі вяселле пераязджала ў дом жаніха. Грамнічная свечка, загорнутая ў кавалак даматканага палатна, ляжала на стале перад маладымі побач з хлебам-соллю, якімі бацькі сустракалі заручаную пару пасля вянчання.

Можа быць, ужо настаў той час, калі мы звернемся да вопыту продкаў і будзем падтрымліваць найлепшыя традыцыі нашай культуры. А таму не кепска будзе запаліць “грамніцу” і ў дні нараджэнняў кожнага з членаў сям’і, калі маладых адпраўляюць у ЗАГС, а парадзіху ў раддом, калі нованароджанага прывозяць дадому і нясуць да храма на хрышчэнне і г.д.





Фота БЕЛТА

## Выкарыстанне грамнічнай свечкі падчас выканання магічных дзеянняў

У народнай медыцыне шырока выкарыстоўваўся наступны метад лячэння. Той орган цела, які трэба было засцерагчы ад хваробы або паспрыяць аднаўленню яго паўсядзённай жыццядзейнасці, выраблялі з дрэва, гліны або воску грамнічнай свечкі, насілі пры сабе як абярэг або адносілі і клалі каля свяшчэнных дрэў, камянёў-следавікоў. У розных храмах Еўропы даводзілася бачыць, як побач з яўленай або міратачывай іконай, да якіх звярталіся па дапамогу аб пазбаўленні ад розных хвароб унутраных органаў, рук, ног, знаходзілася мноства гэтых “органаў”, выплаўленых з серабра і ахвяраваных храму і абразу пасля выздараўлення.

“Сплавамі” грамнічнай свечкі падкурвалі малых дзяцей, калі яны палохаліся; калі некага пачынала калаціць ліхаманка, то яго “ачышчалі” святлом і дымам свечкі і адначасова чыталі спецыяльныя замовы.

Лічылася, што цяля будзе хутка расці, калі адразу пасля ацёлу абкурыць саскі каровы агаркам грамнічнай свечкі і чаборам.

Абкурванне агаркам выконвалі і тады, калі трэба было пачынаць прасці ніткі, калі закладвалі навой для ручніка або посцілак, калі заканчвалі плесці рыбацкую сетку, калі першы раз надзявалі нешта новае.

Калі перад наступнымі Грамніцамі ад мінулагодняй свечкі заставаўся зусім маленькі агарак, яго пакідалі і надалей выкарыстоўвалі для розных мэт як, зноў-такі, лекавы сродак і адзін з моцных амулетаў.

Пры ўмове, што на працягу года свечка выкарыстоўвалася радзей і заставалася яшчэ вялікая частка, яна дапальвалася ў святыя вечары на Каляды, а затым непасрэдна перад Грамніцамі.

**Аксана КАТОВІЧ**



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ